Жыццё і творчасць Алеся Барскага (Аляксандра Баршчэўскага)

У польскай і сусветнай беларусістыцы Аляксандр Баршчэўскі займае выключнае месца не толькі як вядомы навуковец, выдатны гісторык літаратуры, але і як пачынальнік беларускіх даследаванняў у Польшчы, паэт, публіцыст, перакладчык, фалькларыст, педагог, грамадска-культурны дзеяч.

Нарадзіўся Аляксандр Баршчэўскі 2 лістапада 1930 у вёсцы Бандары ў гміне Міхалова на Беласточчыне. З гэтай зямлёй быў звязаны з дзяцінства і меў да яе асаблівыя пачуцці, якія па-мастацку выявіў у сваёй паэтычнай творчасці і ўспамінах.

Яго шлях у навуку не быў лёгкі. Пачатковую адукацыю перапыніла вайна і школу ён скончыў толькі ў пасляваенны перыяд. У 1951 годзе паступіў у Лодзінскі ўніверсітэт, дзе да 1955 года вучыўся на кірунку рускай філалогіі. У 1956 Аляксандр Баршчэўскі пачаў працаваць выкладчыкам Варшаўскага ўніверсітэта. У тым самым годзе ў Варшаўскім універсітэце з'явілася кафедра беларускай філалогіі, з якой даследчык звязаў сваё жыццё на доўгія гады. Тут у 1966 ён абараніў сваю кандыдацкую дысертацыю па тэме «Творчасць Я. Коласа 1906–1930 гадоў». У 2002 годзе стаў доктарам навук, а з 1975 года амаль 30 гадоў быў загадчыкам кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага ўніверсітэта.

Арганізатарскія здольнасці Аляксандра Баршчэўскага прыносілі плён не толькі ў навуковым асяродку, у якім ён працаваў, але і ў літаратурнай арганізацыі "Беларускае аб'яднанне "Белавежа", да якой ён належаў як паэт і якую ўзначальваў у перыяд 1984 – 1992 гг. З 1993 года па ініцыятыве, між іншым, Аляксандра Баршчэўскага ў Польшчы цыклічна адбываецца Алімпіяда па беларускай мове, а сам прафесар доўгі час з'яўляўся старшынёй Цэнтральнага камітэта алімпіяды.

Навуковыя, дыдактычныя і арганізацыйныя дасягненні прафесара Аляксандра Баршчэўскага былі ацэнены як у Польшчы, так і па-за яе межамі шматлікімі ўзнагародамі, між іншым: медалём "Заслужанага дзеяча культуры" (1970), Залатым крыжам за заслугі (1971), залатым медалём "Заслужаны беластаччанін" (1984), медалём Камісіі нацыянальнай адукацыі (1986), медалём Францыска Скарыны (1991), медалём Рыгора Шырмы „За клопат пра мудрасць народу" (2005), медалём „За ўклад у развіццё культуры Беларусі" (2010), ордэнам Францыска Скарыны (2015).

Як паэт Алесь Барскі належыць да ліку найбольш вядомых творцаў Беларускага літаратурнага аб'яднання "Белавежа". Яго паэзія прасякнута далікатнасцю, маляўнічасцю паэтычных вобразаў, любоўю да родных мясцін. Алесь Барскі – аўтар пяці

паэтычных зборнікаў: „Белавежскія матывы” (1959), „Жнівень слоў” (1967), „Мой бераг” (1976), „Блізкасць далёкага” (1984), „Лірычны пульс” (1987) – і кнігі ўспамінаў „З пабачанага і перажытага” (1992). У 2011 годзе ў Мінску яго вершы былі апублікаваныя пад рэдакцыяй Кастуся Цвіркі „Выбраныя творы” (2011), а чатыры гады пазней з’явіўся зборнік пад рэдакцыяй Міколы Хаўстовіча „«І толькі ў мове роднай буду вечны...». Вершаваныя творы” (2015).

Памёр Аляксандр Баршчэўскі 28 сакавіка 2022 года ў Варшаве.

Для больш поўнага знаёмства з жыццём і творчасцю Аляксандра Баршчэўскага рэкамендуем пазнаёміцца з наступнымі артыкуламі:

1. Бароўская, І. (2011) *Песня і малітва: лірыка Алеся Барскага* [у:] *Алесь Барскі. Выбраныя творы,* Мінск, с. 394-398.
2. Казбярук, У. (2011) *След на Зямлі* [у:] *Алесь Барскі. Выбраныя творы*, Мінск, с. 388-393.
3. Лукша, М. (2022) *Алесь Барскі – паэт з Божай ласкі* [online] czasopis.pl/ales-barski-pajet-z-bozhaj-laski
4. Тычына, М. (2011) *Лірыка Алеся Барскага і Афіны Аляксандра Баршчэўскага* [у:] *Алесь Барскі. Выбраныя творы*, Мінск, с. 5-18.
5. Siwek, B. (2020). *Aleksander Barszczewski: uczony i poeta (W 90. rocznicę urodzin)* [w:] *Przegląd Wschodnioeuropejski*, 1, 209-218. [online] http://wydawnictwo.uwm.edu.pl/uploads/documents/czytelnia/przeglad/Przeglad_Wschodnioeuropejski_11_1_2020.pdf